# УНІВЕРСІТЭЦКІ ВЕСНІК

№ 8 (286) верасень 2021

*Выдаецца з мая 1996 г. Перыядычнасць – 1 раз на месяц*

Газета ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»


## Паважаныя калегі!

**Прыміце самыя шчырыя віншаванні з прафесійным святам – Днём настаўніка!**

**Прафесія выкладчыка патрабуе высокага прафесіяналізму, велізарных душэўных і фізічных сіл, мудрасці, цярпення, умення ахвяраваць асабістым часам. Кожны педагог выконвае ўдзячную місію – выхоўвае дастойных грамадзян сваёй краіны, закладваючы асновы заўтрашняга дня, фарміруючы яе інтэлектуальны патэнцыял. Менавіта вы вучыце адрозніваць дабро і зло, прыстойнасць і подласць, патрыятызм і здраду. Дасягненні вашых студэнтаў – гэта ваша заслуга!**

**Дзякуем вам, дарагія педагогі, за няпростую, але вельмі адказную і патрэбную працу! Шчыра жадаем вам цярпення і мудрасці, а таксама моцнага здароўя і вялікіх творчых поспехаў! Няхай вашы вучні будуць таленавітымі, а вашы блізкія заўсёды акружаюць вас сваёй цеплынёй і ўвагай!**

**Поспехаў вам, аптымізму, натхнення, дабрабыту і, канечне, гонару за сваю прафесію!**

## Сардэчна віншуем вас з адным з самых цёплых і душэўных святаў – Днём маці!

***Гэта свята важнае для кожнага з нас. Мы многім абавязаны самым дарагім нашаму сэрцу людзям – мамам. Шчасце таму, каго добрыя матчыны рукі і словы падтрымліваюць не толькі ў дзяцінстве, бо патрэбныя яны ў любым узросце, якімі б дарослымі і самастойнымі мы сябе ні лічылі.***

***Любоў маці дапамагае адкрываць нашы таленты, робіць нас мацнейшымі, дапамагае пераадолець нягоды, справіцца з цяжкасцямі, верыць у сябе і свой поспех.***

***Святкаванне Дня маці – гэта выдатная магчымасць выказаць сваю падзяку і бязмежную ўдзячнасць за ўсё, што робяць для нас нашы мамы, за іх любоў і разуменне.***

***У гэты святочны дзень, дарагія мамы, прыміце словы ўдзячнасці, любові і павагі!***

***Няхай не заканчваецца ваша мацярынская энергія, не хмурнеюць вочы!***

***Жадаем вам лёгкай жыццёвай дарогі, яркіх поспехаў і натхнення!***

***Хай вам хапае часу не толькі на клопат пра сямейны ачаг, але і на рэалізацыю сваіх талентаў і здольнасцей, на ўласныя захапленні!***

***Няхай самыя добрыя, цёплыя і шчырыя словы гучаць для вас не толькі ў гэты дзень, але і на працягу ўсяго жыцця!***

***Хай у вашых вачах не згасаюць усмешкі!***

## Віншуем!

Рэктарат і прафкам супрацоўнікаў універсітэта віншуюць з юбілеем
**КАМАРОВУ Паліну Ягораўну,**
**САБАЛЕЎСКУЮ Вольгу Васільеўну,**
**ГАЛЬПЕРЫНУ Людмілу Леанідаўну,**
**МІРАЕЎСКУЮ Таццяну Уладзіміраўну,**
**СІДАРОВІЧ Антаніну Пятроўну,**
**АНДРЭЕВУ Людмілу Уладзіміраўну.**

Прыміце самыя шчырыя пажаданні здароўя, шчасця і дабрабыту! Хай працоўныя будні не прыносяць стомы, жыццё не пакіне непакораных вышынь, а наперадзе будуць новыя праекты і дасягненні!

# ТЕКУЩАЯ И ИТОГОВАЯ АТТЕСТАЦИЯ СТУДЕНТОВ

***Качественные показатели подготовки студентов и магистрантов определяются в университете результатами текущей и итоговой аттестации. Вопрос о динамике этих важных форм аттестации в 2020/2021 учебном году был заслушан на сентябрьском Совете университета. Предлагаем читателям УВ основные тезисы доклада начальника учебно-методического отдела Ирины Ивановны Ситкевич.***

### РЕЗУЛЬТАТЫ ТЕКУЩЕЙ АТТЕСТАЦИИ

Показатель абсолютной успеваемости *(отношение количества сдавших экзамены к общему количеству сдававших экзамены в процентном соотношении)* в университете по результатам учебного года снизился по сравнению с 2019/2020 учебным годом на 3,4% и составил 81,4%.

Только у историко-филологического факультета показатель абсолютной успеваемости вырос по сравнению с прошлым учебным годом на 1,4%.

Качественная успеваемость *(отношение количества сдавших экзамены на отметки 6-10 к общему количеству сдававших экзамены в процентном соотношении)* снизилась на 1,2% по сравнению с 2019/2020 учебным годом и составила 34,8%.

По сравнению с прошлым учебным годом показатель качественной успеваемости вырос также только на историко-филологическом факультете – сразу на 4,3% и составил 55,2%. Это самый высокий показатель качественной успеваемости за последние несколько лет.

Показатели абсолютной успеваемости летней сессии составили 82,7%, в зимнюю – 80,2% (для сравнения: в прошлом учебном году разница составляла 1,6%, а в позапрошлом – 3,3%).

Результаты качественной успеваемости в летнюю сессию составили 36,5 %, это на 3,2% выше показателя зимней сессии (в позапрошлом учебном году разница составляла 1,1% в пользу летней сессии, а в прошлом – 0,1% в пользу зимней).

В летнюю сессию выросли показатели абсолютной успеваемости на всех курсах по сравнению с зимней сессией: на 1 курсе результаты успеваемости стали выше на 5,5%, на 4 курсе – на 10,6%. Не все наши студенты-первокурсники прошли испытание дистанционным обучением и смогли улучшить свою успеваемость за втрое полугодие, потому в нынешнем учебном году мы начали их обучение исключительно в аудиториях.

В 2020/2021 учебном году снизились результаты успеваемости студентов из числа иностранных граждан по сравнению с предыдущим учебным годом. Показатели абсолютной успеваемости стали ниже на 8,9%, качественной успеваемости – на 0,2% и составили соответственно 61,1% и 6,1%.




### ОТЧИСЛЕНИЯ СТУДЕНТОВ И МАГИСТРАНТОВ

За 2020/2021 учебный год из университета отчислено 212 студентов первой ступени получения высшего образования (на 27 больше, чем в 2019/2020 учебном году), из них:

– за неуспеваемость по трем и более учебным дисциплинам – 35 (18 человек в 2019/2020);

– в связи с не ликвидацией академической задолженности в установленные сроки – 32 человека (31 в 2019/2020);

– за не ликвидацию разницы в учебных планах в установленные сроки при восстановлении в число студентов – 7 человек (5 в 2019/2020);

– в связи с длительным отсутствием (более 30 дней) без уважительных причин на учебных занятиях в течение учебного года – 46 человек (47 в 2019/2020);

– по собственному желанию – 74 человека (66 в 2019/2020);

– по другим причинам – 18 человек (17 в 2019/2020).

Из 212 отчисленных высшее образование в дневной форме получали 102 человека, в заочной – 110.

Не все магистранты, обучавшиеся в университете в прошедшем году, получили диплом. За год были отчислены 25 магистрантов (24 человека – студенты дневной формы получения образования, 1 человек – заочной формы получения образования).

Причины отчислений студентов II ступени высшего образования следующие:

– за неуспеваемость по трем (и более) учебным предметам – 1 человек (специальность «Физическая культура и спорт»);

– в связи с невнесением платы за обучение в сроки, предусмотренные соглашением сторон – 1 человек (специальность «Юриспруденция»);

– в связи с длительным отсутствием (более 30 дней) без уважительных причин на учебных занятиях в течение учебного года – 4 человека (специальности «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)», «Юриспруденция»);

– по собственному желанию – 18 человек (специальности: «Археология», «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)», «Юриспруденция», «Физическая культура и спорт», «Языкознание»);

– за неисполнение обязанностей обучающегося – 1 человек (специальность «Языкознание»).

За прошлый учебный год было отчислено 45 иностранных студентов, что на 38 больше по сравнению с прошлым учебным годом (23 человека – студенты дневной формы получения образования, 22 человека – студенты заочной формы получения образования). Причины отчислений иностранных обучающихся таковы:

– неуспеваемость по трем (и более) учебным предметам – 3 человека;

– неликвидация академической задолженности в установленные сроки – 7 человек;

– длительное отсутствие (более 30 дней) без уважительных причин на учебных занятиях в течение учебного года – 17 человек;

– невнесение платы за обучение в сроки, предусмотренные соглашением сторон – 7 человек;

– по собственному желанию – 11 человек.

### РЕЗУЛЬТАТЫ ИТОГОВОЙ АТТЕСТАЦИИ

В период проведения итоговой аттестации в университете работали 25 экзаменационных комиссий. Выпуск осуществлялся по 21 специальности высшего образования I ступени и 9 специальностям высшего образования II ступени.

Диплом о высшем образовании получили 893 специалиста – на 70 меньше, чем в 2019/2020 учебном году, из них 73 – иностранные граждане, диплом магистра получили 135 обучавшихся (160 в 2019/2020), из них 76 – иностранные граждане.

Результаты сдачи государственных экзаменов в этом учебном году выше показателей прошлого года. Абсолютная успеваемость по университету составила 99,7%. Это на 0,4% выше показателя прошлого года.

В прошедшем учебном году 2 студента заочной формы получения образования получили на государственных экзаменах неудовлетворительные отметки: это студент факультета педагогики и психологии детства (специальность «Логопедия») и студент факультета физического воспитания (специальность «Физическая культура»).

Показатели качественной успеваемости по итогам государственных экзаменов по университету в 2020/2021 учебном году на 6,8% выше результатов прошлого года и составили 62,8.

В 2020/2021 учебном году, как и в предыдущем, был выдан 21 диплом с отличием. Все дипломы с отличием выданы выпускникам дневной формы получения образования. По факультетам распределение количества выданных дипломов с отличием следующее: математики и естествознания – 5; экономики и права – 4; педагогики и психологии детства – 4; историко-филологический – 2; начального и музыкального образования – 2; иностранных языков – 2; физического воспитания – 2.

В целях улучшения профессиональной подготовки студентов председатели ГЭК высказали следующие предложения и рекомендации:

– усилить научно-методическую и практическую подготовку будущих педагогов через изучение нормативных правовых документов, регулирующих организацию образовательного процесса в учреждениях общего среднего образования Республики Беларусь;

– необходимо развивать у студентов дискуссионную культуру – учить их давать ответы на заданные вопросы, прививать навыки аргументации, обоснованности изложения материала, ориентации в применении полученных знаний;

– продолжить внедрение оригинальных методик и современного научно-методического обеспечения для совершенствования самостоятельной индивидуальной работы студентов.

### ЗАЩИТА ДИПЛОМНЫХ РАБОТ

Общее количество дипломных работ, защищенных в этом учебном году – 612, что на 53 больше, чем в 2019/2020 учебном году. 394 дипломные работы защищались в ГЭК студентами дневной формы получения образования, из них на «9»–«10» – 146 работ (37,1%), на «6»–«8» – 202 дипломные работы (51,3%). Студенты заочной формы получения образования защитили 218 дипломных работ, из них на «9»–«10» – 68 работ (31,2%), на «6»–«8» – 144 дипломные работы (66,1%).

В качестве положительного момента председатели ГЭК отметили:

– высокий исследовательский потенциал, инициативность, наличие профессиональной эрудиции и широкий научный кругозор выпускников;

– высокую степень актуальности и научную новизну тематики дипломных работ, их практическую направленность и возможность внедрения в учебный процесс;

– использование мультимедийных презентаций при защите.

**РЕЗУЛЬТАТЫ КАЧЕСТВЕННОЙ УСПЕВАЕМОСТИ СТУДЕНТОВ ПО ФАКУЛЬТЕТАМ**

| Факультет | 2018/2019 учебный год | 2019/2020 учебный год | 2020/2021 учебный год |
|---|---|---|---|
| Педагогики и психологии детства | 38,0 % | 39,0 % | **38,6 %** |
| Начального и музыкального образования | 45,1 % | 45,7 % | **40,7 %** |
| Иностранных языков | 62,3 % | 50,2 % | **48,0 %** |
| Историко-филологический | 50,9 % | 50,9 % | 55,2 % |
| Математики и естествознания | 39,1 % | 32,6 % | **31,0 %** |
| Физического воспитания | 19,3 % | 18,9 % | **17,0 %** |
| Экономики и права | 21,4 % | 28,0 % | **26,6 %** |

Для повышения качества дипломных работ и их значимости в системе подготовки специалистов председатели ГЭК порекомендовали:

– научным руководителям дипломных работ больше внимания уделять оригинальности текста дипломных работ по итогам проверки в системе «Антиплагиат» на стадии предзащиты;

– обновить и разнообразить тематику дипломных работ, обратив внимание на увеличение количества дипломных работ, выполненных по заказу базовых организаций;

– уделять большее внимание соблюдению правил оформления дипломных работ;

– расширить практику внедрения результатов опытно-экспериментальной работы студентов-дипломников в образовательный процесс;

– рекомендовать присутствие научных руководителей и рецензентов дипломных работ на защите для усиления дискуссионной составляющей проведения защиты и обеспечения более высокой степени объективности оценки;

– рекомендовать включать в список использованной литературы дипломных работ большее количество источников белорусских авторов;

– во избежание дублирования отчетной документации исключить Экспертное заключение из перечня документов, прилагаемых к дипломной работе.

### ИТОГОВАЯ АТТЕСТАЦИЯ МАГИСТРАНТОВ

Итоговая аттестация студентов второй ступени высшего образования представлена защитой магистерской диссертации. В 2020/2021 учебном году работало 9 государственных комиссий, защищали магистерские диссертации 135 магистрантов по 9 специальностям.

Показатели итоговой аттестации магистрантов следующие: на «9»–«10» защитилось 116 человек (85,9%), на «6»–«8» – 17 человек (12,6%), на «4»–«5» – 2 человека (1,5%). Магистерские диссертации защищали в том числе 76 магистров – граждан Китайской Народной Республики.

Председатели ГЭК отметили актуальность тематики всех магистерских диссертаций, их научную новизну и практическую значимость. В качестве предложений выделим следующее: с целью дальнейшего совершенствования подготовки специалистов выпускникам магистратуры, их научным руководителям активнее участвовать в работе различного рода конференций с целью подготовки публикаций по апробации результатов исследования.

В целом, анализ текущей и итоговой аттестации студентов в 2020/2021 учебном году показал, что университет на хорошем научно-теоретическом и методическом уровне осуществляет подготовку специалистов и магистров, располагает высококвалифицированными кадрами, осуществляющими такую подготовку.

По итогам обсуждения вопроса на Совете университета деканам факультетов и заведующим кафедрами рекомендовано обсудить с профессорско-преподавательским составом результаты текущей и итоговой аттестации студентов, а также разработать планы корректирующих действий по повышению показателей абсолютной и качественной успеваемости.

**По материалам доклада на Совете университета начальника учебного отдела И.И. СИТКЕВИЧ.**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# КТО НЕ РИСКУЕТ..., ИЛИ ПО ПОЛЯМ, ПО ПОЛЯМ РЕДАКЦИЯ МЧИТСЯ...

**(один день из жизни журналиста-практиканта)**

***Утро 7 июля не предвещало ничего веселого. Журналисты районной редакции занимались своими делами. Кто-то верстал газету, кто-то пытался найти вдохновение, а кто-то договаривался о встрече. На часах было около 11 дня, когда заместитель главного редактора сообщил: «Сегодня едем на район!». Я была ошарашена, но предвкушение от поездки отодвинуло страх на задний план. Это был мой выезд на район, который запомнился надолго.***


За информацией через ... сено

Редакция в составе 4 человек – заместителя главного редактора, фотокора-водителя, веб-журналиста и меня – отправилась за двадцать километров от города, в глубинку. Палящее солнце освещало нам путь. Пели птицы, а мошкара то и дело пыталась залететь в открытые окна машины. Первой остановкой было поле, на котором работали комбайнеры. Подъезжая к нему, мы столкнулись с проблемой: в машину залетело множество оводов. Они были огромными! Приехав на место, мы выбежали из машины и закрыли все окна, пытаясь выгнать их из машины, но наше везение потерялось где-то по дороге, ведь самое веселое только начиналось...

Комбайны, убирая зерновые, оставляют после себя дорожки из соломы, через которые пришлось пробираться. В платьях. Эпичное зрелище, не правда ли? Фотокор не упустил такой живописный момент и сделал пару веселых фотографий. В летнюю жару комбайнерам и трактористам приходиться работать от восхода до захода солнца, чтобы успеть убрать зерновые до наступления жары. Я никогда раньше не видела комбайн изнутри, поэтому в ответ на мою просьбу посмотреть, что же там, один из работников пригласил меня к себе в кабину. «Смотри, у меня тут кондиционер и даже холодильник есть», – показывал свое рабочее место


В прохладной кабине комбайна

комбайнер. Рассматривая множество различных кнопок и рычагов, я не заметила, как прошло время и нужно было отправляться на другое место, но вылезать из прохлады, честно говоря, не хотелось. Да и с комбайнером подружились!

Путь до машины был легче, ведь мы нашли следы, оставленные камазом, и пошли по ним, минуя кучи соломы. Ах, да, думаю не стоит упоминать, что к машине мы шли с опаской быть съеденными сотней оводов? Так вот, выехав на дорогу, мы всё-таки избавились от большинства из них, хотя без укусов не обошлось. Но кто не рискует, тот не пьет шампанское!

Следующим местом в нашем небольшом путешествии была школа, в которой мне необходимо было поговорить с завучем и учениками-олимпиадниками, чтобы осветить их заслуги. Здесь обошлось без приключений, но я в который раз убедилась, что люди, живущие в маленьких населенных пунктах, намного приветливее и добрее, чем в больших городах.

Обратный путь в город был спокойным. Солнце пряталось за лесами, мелькающими вокруг, а журналисты редакции обсуждали «улов». Каждый поделился своими впечатлениями, и я поняла, что этот день станет одним из самых насыщенных за все мое лето.

**Алина САВОШ, студентка 2 курса историко-филологического факультета.**

# "ІМГНЕННЕ З ВЕЧНАСЦІ"

***Ці можна спыніць імгненне? Фраза з вядомай трагедыі Гётэ "Фауст" "Остановись, мгновенье, ты прекрасно" ўжо даўно стала крылатай, што само па сабе з'яўляецца пацвярджэннем таго, колькі разоў звяртаўся чалавек да Бога з просьбай спыніць час, каб хоць яшчэ на трошачкі працягнуць адчуванне прыгажосці, захаплення, адзінства з каханым чалавекам.***


"Пахі знікаючых лугоў". 2020 г.

Але няўмольны час ідзе, бяжыць, імчыцца. І ніякай надзеі на тое, каб затрымаць яго, няма...

А можа ўсё-такі ёсць?

15 верасня 2021 года ў музеі Бялыніцкага-Бірулі адбылася юбілейная выстава памяці Фёдара Сцяфанавіча Кісялёва пад назвай "Імгненне з вечнасці". У гэты дзень мастаку магло б споўніцца 75 год.

Персанальная выстава твораў Фёдара Сцяфанавіча Кісялёва праходзіла ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь з 16 жніўня па 22 верасня. А ў магілёўскім музеі былі паказаны карціны Фёдара Сцяфанавіча і яго вучняў – акварэлі, пейзажы, помнікі архітэктуры, рамантычныя і філасофскія вобразы...

Сярод твораў Кісялёва – "Старыя рэчы" (2019), "Пахі знікаючых лугоў" (2020), "За акном ідзе зіма" (2020), "Шэпт халодных лугоў"(2020)...

Творы вучняў – "Карабельчык" (Ева Гершановіч, 10 год), "Жоўтае і сіняе" (Паліна Пархоменка,10 год), "Любімая расліна" і "Сіняя пастаноўка" (Алёна Карпава, 15 год), "Гімалаі кажуць" (Марыя Бачкова, 17 год).

Аўтар змог перадаць настрой праз колер. Калі мы бачым, напрыклад, карціну "Пахі знікаючых лугоў", мы адразу пачынаем адчуваць водар рамонкаў, смак яблык. А каля "Яго начной песні" мы адразу адчуем сум, адзіноту, неспакой. "Успамін пра каханне" абудзіць самыя пяшчотныя ўспаміны, бо каханне – адно з наймацнейшых пачуццяў, і кожны, хто адчуваў яго, не можа раўнадушна прайсці міма гэтай карціны. Карціна "За акном ідзе зіма" вяртае нас у дзяцінства, калі ты, яшчэ зусім маленькі, прачынаешся ў вясковай хаце, дзе цёпла, утульна, таму што мама паліць у печы, на двары ідзе снег, вакол беласнежная прыгажосць, а цэбе не пакідае адчуванне


"Успамін пра каханне". 2021 г. Эцюд

цуда, бо хутка Новы год, можна пайсці з сябрамі ляпіць снегавіка, гуляць у снежкі, упрыгожваць елку.

І адказ на пытанне "Ці можна спыніць імгненне?" ужо не ўяўляецца такім безнадзейным.

**Павел ПАДДУБСКІ, студэнт 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ПЕРВЫЙ ЗВОНОК «НАТХНЕННЯ»

***22 сентября состоялось первое в новом учебном году заседание литературного объединения «Натхненне». Мероприятие было посвящено знакомству с первокурсниками, проявляющими себя в литературном творчестве.***

Заседание началось с рассказа руководителя литобъединения кандидата


Участники первого в новом учебном году заседания литобъединения «Натхненне»

филологических наук доцента кафедры общего и славянского языкознания Михальчук Н.А. об истории творческого объединения, о разнообразных формах работы со студентами. Были поставлены цели и определены задачи на новый учебный год. Обсудили на заседании и мероприятия, запланированные на осеннее время.

Среди первокурсников, которые поделились с ребятами своими стихотворениями и прозой, были студенты белорусского отделения Артем Яковлев и Полина Пчелова. Творческие личности, поступившие в этом году на историко-филологический факультет и заинтересовавшиеся работой «Натхненья», – это и прозаик Вероника Бойцова (специальность «Русский язык. Иностранный язык»), прозаик Ксения Коленькова (специальность «Русский язык. Иностранный язык»), поэтесса Мария Сидорович (специальность «Белорусский язык и литература»), ценители образного слова Ольга Сушко, Лия Зайцева, Алина Шаповалова (специальность «Русский язык. Иностранный язык»).

Было чем поделиться с постоянным участникам «Натхненья»: впечатления от каникул, возвращение в родные места, работа в оздоровительных лагерях и, конечно же, особое «летнее» вдохновение, новые стихотворения и поэтические циклы. Перед студентами выступила со своими прекрасными произведениями выпускница МГУ имени А.А. Кулешова, учитель СШ 22, магистрант заочной формы обучения МГУ имени А.А. Кулешова Татьяна Ларионова. Радостно, что Таня не забывает «Натхненне», которое посещала на протяжении четырех лет учебы в университете. С недавно написанными оригинальными стихотворениями выступили студентка 3 курса Арина Горбатенко, студенты 2 курса Анастасия Мухина и Полина Михаськова.

В заключение мероприятия свои новые произведения прочитала студентам руководитель литературного объединения Наталья Александровна Михальчук.

Всех присутствующих на заседании объ-


Свои стихи читает выпускница 2021 года Татьяна Ларионова

единяли вдохновение, творческий порыв, интерес к чужим произведениям и желание поделиться важным для себя.

Впереди у «Натхненья» – большие планы на учебный год.

Ребята, присоединяйтесь к нам!

**Наталья МИХАЛЬЧУК.**

# Надзея – гэта...

Надзея – гэта агеньчык,
які грэе ў самы люты дзень.
Гэта той парасон,
які абараняе цябе ад дажджу.
Гэта цень, які з'яўляецца ,
калі спякота.
Гэта падтрымка перад змаганнем.
Гэта тое, што дае моц
і ўзбраняе дух.
Надзея – гэта кожны дзень!

# Гісторыкі

*Прысвячаецца маладым*
*гісторыкам –*
*прыгожым дзяўчатам,*
*вясёлым хлопцам – і брацiку.*

Вітаўт,
Рагвалод,
Аляксандр Македонскі,
Вайна і мір,
Сваркі і спрэчкі,
Тэмы і пытанні,
Адказы і адкрыцці.
Мінулае і сучаснасць –
гэта вы, гісторыкі!
Яскравыя вочы і мудры погляд,
4 лічбы – ваш адказ,
Што? Калі? Дзе? – вашы пытанні,
Крыніцы, падручнікі,
манаграфіі – ваша ежа.
Гісторыя – ваша жыццё!

# Дзяўчына-зорка

Цёплая, як сонейка,
Светлая, як зорка,
Цікавая, як жыццё,
Прыгожая, як кветка,
Самая вялікая зорка майго жыцця,
Мая надзея і мой лёс,
Маё паветра,
Маё жыццё і сэнс,
Мой дзень і мая ноч,
Мая добрая раніца і цёплы вечар,
Новы час і новы дзень,
Мой холад у ліпені і цяпло ў лютым,
Мая нечаканая зорачка.
Маё каханне!

***Аляксей САМУСЕЎ, студэнт 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.***

# Открытие театральных встреч «Лялькін куФЭр»

***3 сентября студенты МГУ имени А. А. Кулешова посетили мероприятие, посвященное открытию театральных встреч «Лялькін куФЭр».***


Студенты МГУ имени А.А. Кулешова в Могилевском областном театре кукол



В первую пятницу сентября в Могилевском областном театре кукол состоялась встреча с журналистами, посвященная открытию театральных встреч ведущих театров кукол Республики Беларусь, на которой побывали студенты МГУ имени А. А. Кулешова. Ребятам предоставилась возможность узнать о целях, задачах проекта и планах на будущее.

Помимо приглашенных лиц, на мероприятии присутствовали заместитель председателя Могилевского облисполкома В.А. Малашко, начальник управления культуры Могилевского облисполкома О. В. Стельмашок, директор Могилевского областного театра кукол В. С. Андреенко, режиссер-постановщик Могилевского областного театра кукол Т.Р. Корепин и др.

Также по театру была проведена экскурсия, в процессе которой наши студенты вместе с гостями подробно ознакомились с организацией и устройством Могилевского областного театра кукол.

***Виолетта ЗАХАРЕВИЧ, студентка 2 курса историко-филологического факультета.***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СПОРТИВНЫЕ БАТАЛИИ

***Спортландия среди второкурсников историко-филологического факультета прошла 10 сентября в спортивном зале корпуса № 1.***

Это мероприятие стало ежегодным и воспринимается как хорошая традиция. Преподаватели физической культуры организуют спортландию для каждого факультета. Так, наши ребята 10 сентября были разделены на три равные



команды, и каждая из них «выкладывалась» в полную силу. Счет был равным до последнего конкурса, именно в нем все решилось: по итогам спортландии команда «зеленых» вырвалась вперед и стала лучшей, второе досталось «красным», третьими вышли «синие». В этом соревновании было все: и желание победить, и горящие глаза, и страсть, и уважение к сопернику… Звучит интригующе, правда?



На наши вопросы согласились ответить капитаны команд.

**Анар Мамедов, 2-й курс, историк-археолог**

***– Каково быть капитаном команды? Ведь на тебе лежит огромная ответственность.***

– Надо сказать, что быть капитаном действительно огромная ответственность. После спортландии мне сказали, что я справился с этой ролью. Было сложно, но очень интересно.

***– Твое впечатление после спортландии?***

– Вообще, я люблю всякие игры, потому что я азартный человек. Однако в то же время для меня главное – участие. Спортландия понравилась. Я в который раз убедился, что у меня классные друзья и вместе мы можем свернуть горы!

**Павел Подобед, 2-й курс, историк-археолог**

***– Как ты мотивировал свою команду?***

– Честно, мотивация была у всех огромная. Каждый хотел выиграть. Поэтому мотивировать никого не нужно было.

***– Что тебе больше всего запомнилось?***

Наверное, последний конкурс. Он вроде назывался «конкурс капитанов». К сожалению, я его завалил полностью. Даже преподаватель физкультуры был в шоке. Он такое видел впервые.

**Виталий Кекер, 2-й курс, историк-обществовед**

***– Твоя команда победила, причем вы вырвали победу в самой концовке. Что ты ощущал после оглашения результатов?***

– Я был немного шокирован, потому что команду набирал явно не для победы. Мне хотелось хорошо провести время. А вот победа – это уже приятный бонус.

***– С какими трудностями ты столкнулся?***

– Трудностей, наверное, я не припомню. Только если несыгранность команды в первое время.

Увлечь студента, казалось бы, не так-то просто, но практически все участники соревнований буквально жили спортивными баталиями на площадке. Игра была максимально эмоциональной. Подобные мероприятия вызывают позитивное настроение, приобщают к здоровому образу жизни, способствуя созданию благоприятного морально-психологического климата в коллективе.

**Беседовал Антон МУРАШКО,
студент 2 курса историко-филологического факультета.**

# ПОКОРЯЯ НОВЫЕ ВЕРШИНЫ

ЛИДЕР

***Финал XII национального конкурса красоты «Мисс Беларусь» прошел 10 сентября в столичном Дворце спорта. Именно там 29 девушек показывали себя во всей красе и боролись за главное звание. Студентка 3-го курса МГУ им. А. А. Кулешова Яна Геращенко приняла участие в этом непростом конкурсе.***



*Яна Геращенко*

«Мисс Могилев» – звучит красиво, правда? Никто не догадывается, что за этим званием стоит не только красота, но труд и упорство. Яна учится на факультете начального и музыкального образования. Смело можно сказать, что она очень творческий человек, любит танцевать и занимается в модельной школе. «На нее всегда можно положиться», – именно так о ней отзываются ее сокурсники.

Как проходил отбор в главный конкурс страны для девушек, насколько сильной была конкуренция и немножко мотивации – об этом мы узнали непосредсвенно от участницы. Яна Геращенко с удовольствием ответила на наши вопросы:

***– Как ты узнала о конкурсе и как попала туда?***

– Я просто очень давно занимаюсь моделингом и с детства любила смотреть на финал этого конкурса по телевизору. Участвовала в конкурсе красоты «Мисс Могилёв 2019». Там заняла первое место. Я тогда только в 11 классе была, а вот сейчас подошла по возрасту для «Мисс Беларусь». Решила испытать удачу – и вот прошла в финал!

***– Как проходил отбор на конкурс?***

– Сначала у нас в Могилёве был отбор, потом в Минске. Из всех девочек отобрали 100 человек, а позже выбрали 40, опять ездили на собеседования. И вот после всех всех этапов уже отобрали 29 человек, в числе которых оказалась и я.

– Насколько сильной была конкуренция?

– Очень сильная! Когда я посмотрела на девочек, которые были в сотке участниц, то была в восторге. В нашей стране безумно красивые девушки. Не было никаких конкурсов, просто мы выходили по тройкам, дефилировали, потом рассказывали о себе и нам задавали различные вопросы. Потом уже, исходя из первого впечатления, жюри делало выбор. Конечно, в преимуществе девушки с хорошей фигурой, ростом, приятной внешностью. Желательно, чтобы они были разносторонними личностями, активными, позитивными, знали языки.




*Я. Геращенко – победительница конкурса «Мисс Могилев – 2019»*

***– Как ты готовилась к финалу?***

– У нас каждый день проходили репетиции, где мы учили схемы для показов. Также нам проводили лекции косметологи, диетолог и психолог. Что касается лично моей подготовки, то я старалась все свободное время уделять спорту, чтобы поддерживать себя в хорошей форме. Также очень важно следить за питанием, и иногда приходится себя ограничивать в сладком. Конечно, я не забывала об отдыхе, чтобы на репетициях быть бодрой и не упустить важную информацию.

***– Был ли какой-нибудь интересный или самый запоминающийся момент на конкурсе?***

– Здесь каждый день наполнен разными интересными моментами и сложно выделить что-то одно. Но, наверное, все-таки экскурсионная поездка на завод «МАЗ». Мы были в месте, где делают эти самые огромные машины, автобусы, самосвалы. Видели сам процесс сборки, это всё безумно масштабно и увлекательно. Потом мы поехали смотреть на спортивные автомобили, побывали внутри них, познакомились с командой, которая участвует в соревнованиях. И потом команда нас приятно удивила подарками.

***– Что тебя мотивирует на победу?***

– Меня мотивируют люди и свои личные успехи. Когда у меня что-то получается, то хочется работать все больше и больше, чтобы достичь новых высот.

**Беседовал – Антон МУРАШКО,
студент 2 курса историко-филологического факультета.
С использованием материалов сайта: https://mogilevnews.by.**

# ЧАРОЎНАЯ ЦУДА-КРАІНА «ОЛЬСА»

ПРАКТЫКА

***Лагер – гэта маленькае жыццё, дзіўнае месца, дзе можна нават за адну змену атрымаць мора задавальненняў, эмоцый і ўспамінаў. Дзіцячы аздараўленчы лагер «Ольса» (Клічаўскі раён, в. Патока) для мяне з'яўляецца менавіта такім, таму што тут я праводзіла амаль усё сваё дзяцінства. Кожны год лагер абнаўляецца, развіваецца, становіцца прыгажэйшым. Час ідзе. І гэтым летам я зноў у любімым лагеры, толькі ўжо ў ролі важатай. Мая першая практыка. Мая першая адказнасць за такую вялікую колькасць дзяцей.***

За змену было ўсё: ўзлёты і падзенні, шчырая радасць і мімалётны смутак. Працавала я з другім атрадам, у які прыехала 20 дзяцей 10-12 гадоў. Не скажу, што гэта было проста, бо дзеці



гэтага ўзросту не гатовы слухаць і слухацца. Першыя дні ўсе дзеці саромеліся і неахвотна размаўлялі адно з адным. Але, нягледзячы на ўсе цяжкасці, шляхам гульняў і мерапрыемстваў мы дасягнулі згуртаванасці і прыязнасці. Хочацца сказаць дзякуй маім напарніцам, якія вельмі дапамагалі ў такой нялёгкай працы. За 18 дзён у лагеры ў нас нікому не было сумна. Кожны дзень быў насычаны справамі, забаўкамі, гульнямі. За гэтыя дні дзеткі паспелі многае: удзельнічалі ў розных спартыўных і інтэлектуальных мерапрыемствах, глядзелі мастацкія фільмы, праходзілі цікавыя квэсты і пазнавальныя віктарыны. Усяго і не пералічыць… З дакладнасцю магу сказаць, што кожнае дзіця таленавітае. Проста гэты талент, магчыма, яшчэ не раскрыты.



Для паўнавартаснага адпачынку былі створаны ўсе ўмовы: пяціразовае харчаванне, абсталяваныя спартыўныя пляцоўкі, дзе дзеці праводзілі большасць свайго часу, інвентар, бібліятэка. Вялізная падзяка педагогу-арганізатару і старэйшаму выхавальніку за арганізацыю вольнага часу і дапамогу ў правядзенні мерапрыемстваў.

За час адпачынку ўсе дзеці вельмі моцна прывязаліся адзін да аднаго. Мы дружна жылі адной сям'ёй. Але прыйшоў той самы дзень, калі не хочацца расставацца. Дзень развітання. На мерапрыемстве па закрыцці змены кожнае дзіця яшчэ раз прадэманстравала свае таленты! Было весела і адначасова сумна… Я пакінула змену з прыемнымі ўспамінамі. Адназначна скажу, што ў наступным годзе я не выпушчу магчымасць яшчэ раз пеpажыць усе тыя эмоцыі, што атрымала за час сваёй першай практыкі.

Ольса, милая Ольса!
Ты прекрасная чудо-страна.
Ольса, милая Ольса.
Ты веселья и счастья полна.
Подари всем надежду и веру,
Бесконечность и вечность добра!

**Дар'я ГРУДАВА,
студэнтка 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# СЭРЦА АДДАЮ ДЗЕЦЯМ…

***Хто з нас, дарослых, не марыў апынуцца хаця б на імгненне зноў у краіне дзяцінства?! Кожны. Але далёка не кожны ведае, што гэта не толькі словы, што гэта сапраўды магчыма. І ў першую чаргу, калі ты педагог або толькі робіш першыя практычныя крокі на шляху да гэтай прафесіі.***

Пасля трэцяга курса ў студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта прадугледжана вытворчая педагагічная практыка ў адукацыйна-аздараўленчай установе ў якасці выхавацеля, або, як казалі раней, важатага.



Вось і мне пашчасціла ўжо другое лета быць выхавацелем у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры "Зубронак". Гэту ўстанову інакш называюць краінай дзяцінства. І я з гэтым згодна, бо як яшчэ называць месца, дзе заўсёды пануе дзіцячы смех, пазітыўныя эмоцыі?

Мінулае лета таксама праводзіла ў гэтым месцы. І тады гэта быў мой першы педагагічны вопыт. Увесь наступны год пасля марыла зноў паспрабаваць сябе ў ролі важатай. Марыла прыехаць у той іншы, як здаецца ў першыя хвіліны знаходжання тут, свет. Мара здзейснілася. І вось я тут.

У гэтым годзе вопыт незвычайны для мяне, таму што дзеці, з якімі я працавала раней, мелі ўзрост 15-17 год, а тут да мяне прыехалі маленькія чалавечкі (8-10 год). Таму на працягу ўсяго часу выхоўваць прыходзілася не толькі маленькіх чалавечкаў, але, у першую чаргу, і сябе. У цяжкія хвіліны галоўнае – не забываць, што і табе самому калісьці было 8 год, што калісьці і ты быў хоць аднойчы такім бездапаможным і безабаронным перад незнаёмымі людзьмі, у новым месцы.

Сухамлінскі пісаў: "Сэрца аддаю дзецям". Гэты выраз разумееш з усёй дакладнасцю, калі на працягу 54-х дзён кожныя 18 дзён сустракаеш новы атрад дзяцей і кожнага з іх ты з першых хвілін пачынаеш лічыць сваім, бо на гэты, здавалася б, маленькі перыяд – 18 дзён – ты для іх не проста выхавацель, а яшчэ і сябар, маці, сястра і той чалавек, да якога яны ідуць вырашаць набытыя праблемы. Кожны з іх пакідае свой непаўторны след у сэрцы, у душы. Кожны ўносіць пэўныя карэктывы сваімі паводзінамі і адносінамі ў твой светапогляд. Папрацаваўшы нават адну змену, трэба адразу разумець, што ўжо не будзеш тым чалавекам, якім прыехаў сюды. Падчас працы пераглядаеш свае адносіны да людзей, да дзяцей, нават да сябе самога. Маленькія дзеці – гэта непазнаны свет. Здаецца, што ты ўсё пра іх ведаеш, а на самай справе кожны дзень адбываецца штосьці, што не можа не здзіўляць. І толькі адно застаецца нязменным – гэта дзіцячая любоў, калі маленькія ручкі цягнуцца да цябе, калі цябе заўсёды чакаюць і крыўдзяцца, калі ты сыходзіш з працы.



Такая педагагічная практыка неабходна, на мой погляд, кожнаму, хто так ці інакш збіраецца працаваць з дзецьмі, бо дзе яшчэ можна навучыцца за 18 дзён рабіць немагчымае?

Словы з песні А. Янкоўскага "Сэрца важатага" гучаць так: "Тваё сэрца, важаты, павінна быць вялікім". І ў гэтых словах адсутнічае пафас, бо кожны раз ты павінен знаходзіць сілы на новых дзяцей, кожны раз ты аддаеш ім часцінку свайго сэрца. Гэты выраз адлюстроўвае ўсю сутнасць прафесіі-птушкі – прафесіі "важаты"!!!

**Яўгенія НІКІЦЕНКА,
студэнтка 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

АСОБА

# ТВАЯ ПАЧЭСНАЯ СПРАВА – ЖЫЦЦЁ АДКРЫВАЦЬ ДРУГОМУ...

**На кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства працуе цудоўны выкладчык – Ячмянёва Ірына Мікалаеўна. А яшчэ яна цудоўны куратар і проста добры чалавек. І зусім нядаўна ў яе быў юбілей. Наша група рада выкарыстаць магчымасць павіншаваць любімую выкладчыцу праз “Універсітэцкі веснік”.**


І.М. Ячмянёва

***Аляксей Самусеў і Таццяна Слуцкая:***

– Ірына Мікалаеўна стала для нас як другая маці. Яна ніколі не застаецца ў баку ад нашага ўніверсітэцкага жыцця, заўсёды дапаможа і накіруе ў правільны бок. Ірына Мікалаеўна такі чалавек, пры сустрэчы з якім заўсёды хочацца ўсміхнуцца. Па праўдзе кажучы, мы не можам сабе ўявіць сваё ўніверсітэцкае жыццё без нашай Ірыны Мікалаеўны.

***Ірына Богнат:***

– Ірына Мікалаеўна! Велізарная падзяка вам за тое, што вы дзеліцеся сваімі ведамі, робіце сваю працу з любоўю. Вы не толькі выкладчык, у першую чаргу вы чалавек з вялікай літары. Дзякуй вам за вашу вельмі патрэбную працу!

***Максім Тультоў і Анастасія Лужанкова:***

– Ірына Мікалаеўна – адзін з найлепшых выкладчыкаў у нашым універсітэце, да ўсіх студэнтаў знаходзіць падыход, крэатыўна і цікава падае праграмную інфармацыю. Як куратар нашай групы, рэгулярна аказвае эмацыйную падтрымку, у цяжкіх сітуацыях заўсёды дапаможа парадай. Мы ніколі не забудзем нашу першую сустрэчу з ёй. Яна прынесла святло і спакой нашым усхваляваным сэрцам, мы адразу зразумелі, што нам ва ўніверсітэце будзе камфортна!

***Вольга Пацэвіч:***

– Паважаная Ірына Мікалаеўна! Ваша ўвага, аказаная нам, вельмі грэе душу. Так прыемна, калі сярод злосці і непаразумення нехта не баіцца паказаць чуласць і спачуванне. Хай ваша жыццё напаўняецца мелодыяй цікавых падарожжаў, прыемных сустрэч, добрых людзей – такіх жа, як вы, утульных і сардэчных.

***Ксенія Ганчарова, Ангеліна Драздова і Аляксандра Касікоўская:***

– З першых дзён нашага навучання Ірына Мікалаеўна стала для нас другой маці. Якія б у нас ні былі цяжкасці, яна заўсёды падтрымае і супакоіць. Жадаем і надалей заставацца такой шчырай, сапраўднай, добрай, ласкавай і жыццярадаснай жанчынай. Ад душы дзякуем вам! Вельмі шануем вашу цярплівасць і разуменне, адданасць справе і любоў да студэнтаў! Моцнага здароўя, душэўнай раўнавагі, шчасця, бадзёрасці і дабрабыту.

***Крысціна Мусурыўская і Дар’я Паралёва:***

– Мы вельмі часта ўспамінаем, як Ірына Мікалаеўна нас падтрымлівала ў час, калі ў нас былі нейкія хібы па вучобе. Гэта сапраўды дапамагала не падаць духам і ісці далей, нягледзячы на ўжо апушчаныя рукі. Вялікі дзякуй вам за падтрымку!

***Кацярына і Павел Паддубскія:***

– Ірына Мікалаеўна найласкавейшай душы чалавек, інтэлігентны, прыемны, лагодны, светлы, цікавы. З ёй заўсёды ёсць пра што пагаварыць, яна гатова дапамагчы, а таксама яна шмат робіць для студэнтаў, і мы вельмі ўдзячныя за яе дапамогу. Знаёмства з ёй – адно з найлепшых у нашым жыцці.

***Настасся Мытнік***

– Вялікі дзякуй вам за тое, што вы ёсць! Мне вельмі прыемна, што такая шчырая і сардэчная жанчына з’яўляецца маім куратарам! Напярэдадні Дня настаўніка хочацца сказаць, што вы, Ірына Мікалаеўна, наш прыклад таго, якім павінен быць сапраўдны настаўнік! І верш Алены Руцкой “Настаўніку” – гэта і пра вас таксама:

На роспач не маеш права,
Хаваеш слабасць і стому.
Твая нялёгкая справа –
Жыццё адкрываць другому.


Выкладчыкі кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства


Са студэнтамі-філолагамі на ІІ Нацыянальным форуме “Музеі Беларусі”

**Студэнты 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

Вопрос о происхождении языка до сих пор остаётся загадкой. Его пытаются разрешить с древнейших времен. Древнегреческие философы рассматривали проблему происхождения языка в единстве с осмыслением его природы и сущности. Отличительная особенность античных теорий состоит в том, что в них переплетаются два аспекта: идея божественного откровения и идея этимологизирования.




Первое направление представлено в мифологическом варианте: язык дан людям богом торговли, хитрости и красноречия Гермесом, придумавшим азбуку. Второе направление связано с поиском внутренней формы слов – источника именования вещей.

Сторонники гипотезы «фюзей» (по природе) во главе с Гераклитом полагали, что имена (слова) – это тени и отражения вещей (предметов), и связывали восприятие вещей со звучанием их названий, в которых зашифрована суть вещи.

Демокрит придерживался противоположной точки зрения. Он утверждал, что имена существуют по установлению людей, и был основоположником гипотезы «тезей» (по соглашению). По его мнению, между словом и наименованным предметом существует непроизвольная, условная, а не природная связь. В качестве доказательства случайности названий философ приводил четыре аргумента: наличие в языке омонимии (обозначения одним именем разных предметов), синонимии (обозначение разными именами одного и того же предмета), возможности переносов названий одних предметов на другие.

Спор между «натуралистами» и «конвенционалистами» отражён Платоном в его знаменитом диалоге «Кратил, или о правильности имён». Представители первых показаны в лице персонажа Кратила, а представители других – в лице Гермогена. От имени автора в этом диалоге выступает Сократ, пытающийся найти компромисс между двумя гипотезами путём разграничения первичных и производных слов. Сократ утверждает, что язык создавался как на основе природной связи между вещами и словами, так и на основе условной связи между ними. В первом случае мы имеем дело с правильными («врождёнными от природы») именами, соответствующими сути вещей, а во втором – с неправильными.

Таким образом, Платон признаёт правоту и «натуралистов», и «конвенционалистов», но в итоге примыкает к первым. Это выражается в его отношении к деятельности идеального «законодателя», «творца имён», который должен создавать новые слова таким образом, чтобы они своим звуковым составом отражали природу обозначаемых вещей.

**Материал подготовила Е.А. БОЛТОВСКАЯ.**

# ТАМ, ГДЕ ТЕЧЕТ КРИНИЦА...

***Недалеко от границы Беларуси и России есть чудесное местечко, привлекающее верующих и любознательных людей. Живописные пейзажи, кристально чистая криница, старинные полуразрушенные здания и мистика. Это необычное место – Успенский монастырь, который действует до сих пор. В простонародье – Пустынки.***


Лик Христа на одной из стен Пустынского монастыря

Расположен он в Мстиславском районе на месте бывшей деревушки, которая называлась Пустынки, в 500 метрах от границы с Россией. Это место окутано множеством легенд и мистических историй. Чего только стоит лик Христа на стене в одной из комнат Покровской церкви, находящейся на территории монастыря!

Среди людей ходит легенда, что в 1380 году ослепший князь Лугвений Ольгердович умылся водой из здешней криницы и прозрел. На этом месте он поставил часовню и велел основать монастырь. До 1601 года монастырь принадлежал православной церкви, а затем находился под управлением униатов, после 1839 года – русской православной церкви. За это время он не раз разрушался, сжигался и снова восстанавливался. Однако после революции монастырь закрыли, храмы разрушили, в остальных постройках разместили школу и детский дом. Затем их закрыли, и в Пустынки пришло запустение. Иронично, не так ли? После войны в частично сохранившиеся здания пришли монахи. Они очистили близлежащую территорию, заасфальтировали дорожки, восстановили церковь и оборудовали купальню. Теперь каждый может приехать и «окунуться с головой» в чудотворную воду криницы.


Древняя целебная криница

Но на чудесном прозрении князя мистика не заканчивается. В одной из комнат Покровской церкви на стене находится нерукотворный лик Иисуса Христа. Никто не знает, как он появился. Многие скептики до сих пор считают его «чьим-то творением», способом привлечения туристов, но как бы они ни пытались найти доказательства того, что лик был нарисован, пока эти попытки не увенчались успехом. Однако прихожане верят в милость Божью, что именно таким способом Бог дал благословение на восстановление памятного места.

Сейчас Успенский монастырь и все постройки на его территории являются историко-культурной ценностью. Тысячи туристов приезжают в Пустынки, чтобы окунуться в атмосферу уходящей истории. Ведь как бы мы ни пытались сохранить такие необыкновенные места, время забирает свое...

**Алина САВОШ,**
**студентка 1 курса историко-филологического факультета.**

# ПРЫГОДЫ СІРЫЙСКАГА ВАТАЧНІКА НА БЕЛАРУСІ

***Здаецца, мы столькі многа ведаем аб раслінах, якія растуць на беларускіх абшарах, а тым больш на тэрыторыі нашага раёна. Але ж часам штосьці незвычайнае трапляе нам прама на вочы, а мы не адразу заўважаем.***



Вось, напрыклад, знойдзецца ў кагосьці з землякоў пара старых фотаздымкаў. На адным – вясёлая кампанія бялыніцкай моладзі напрыканцы 1940-х гадоў. На другім – прыгажуня ў больш познія часы. Але што іх аб’ядноўвае, дык гэта наяўнасць, здавалася б, малапрыкметных раслін на заднім плане. Гэта і ёсць ватачнік сірыйскі, альбо Asclepias syriaca.

На першым здымку справа бачны будынак цяперашняга Цэнтра карэкцыйнага развіцця, навучання і рэабілітацыі. Стрэлачкамі пазначана месца вырастання незвычайнай расліны. Як яе толькі не спрабавалі называць мясцовыя жыхары: і акопнік, і тапінамбур, і дзярбеннік, але сапраўдная назва заінтрыгоўвае – чаму менавіта «ватачнік» і чаму ён – «сірыйскі»?

Тут інтрыга толькі пачынаецца: высвятляецца, што да Сірыі расліна не мае ніякага дачынення. Сапраўдны арэал яе распаўсюджвання – большая частка амерыканскіх штатаў за выключэннем сухіх прэрый. Як жа патрапіў незвычайны вандроўнік на бялыніцкую зямлю з іншага краю зямлі?

У ЗША клімат вагаецца ад умеранага (сярэдняга) да субтрапічнага, таму галоўны герой нашага аповеду там існуе паўнавартасна. Мы ж знаходзімся ў кліматычных умовах, блізкіх да клімату Канады, значна паўночней ад родных мясцін гэтай расліны.

Тое, што ватачнік сапраўды прэтэндуе на званне незвычайнага, лёгка ўпэўніцца. Такія суквецці ўпрыгожваюць высокія сцябліны і шырокае лісце ватачніка ў сярэдзіне лета і прываблiваюць вялікую колькасць пчол – расліна з’яўляецца меданосам, да таго ж распаўсюджвае па наваколлі прыемны водар.

Суквецці маюць «парасонападобную» форму і складаныя прыстасаванні для апылення насякомымі. Ватачнік мае плады, але яны не выспяваюць у нашым клімаце.



Пры пашкоджанні сцябла альбо лісця, на паверхні з’яўляецца густы белы сок, падобны на малако. Таму расліну называюць яшчэ «млечная трава», альбо «ластаўчына трава». Ёсць павер’е, што ластаўкі такім «малачком» прамываюць вочкі птушанятам, каб тыя хутчэй раскрыліся.

Самае цікавае ў расліны – вельмі незвычайнае насенне.

*Дарэчы, сваю назву ватачнік атрымаў памылкова. Італьянскі падарожнік і натураліст Карнуці пераблытаў цяперашні ватачнік з раслінай кутра, якая расце на Блізкім Усходзе. Назва была прынята афіцыйна, пазнейшыя даследчыкі памылку адзначылі, аднак назву пакінулі ранейшую.*

Насеннне мацуецца ў «каробачцы» вельмі мяккімі навобмацак шаўкавістымі ніцямі.

Паколькі і «каробачкі», і шаўкавістая маса з’яўляюцца вільгацеўстойлівымі, то з гэтых матэрыялаў у мінулым стагоддзі выраблялі кінаплёнку. Іншая сфера прымянення – пры вытворчасці выратавальных сродкаў, як дадатковы складнік у вырабах з шоўку, бавоўны, шэрсці. Са сцяблін калісьці рабілі валокны для марскіх канатаў, вяровак, грубай тканіны.

Ватачнік прывезлі ў Еўропу маракі ў XVII стагоддзі. На тэрыторыю Расійскай імперыі расліна патрапіла ў XIX стагоддзі. Пры некаторых заможных сядзібах пачаліся спробы вырошчвання ватачніка з мэтамі яго прамысловага выкарыстоўвання. Ёсць меркаванне, што менавіта ў межах эксперыментаў па вырошчванні рэдкай замежнай культуры з’явілася яна і на тэрыторыі гаспадарчых пабудоў былога панскага маёнтка ў Бялынічах.

Але пазней, калі была разбурана і сама сядзіба, і дапаможныя будынкі вакол яе, на госця з далёкай Амерыкі асабліва ніхто не звяртаў увагі. Так ён і рос сам па сабе. Хаця ўсім трэба было б ведаць, што батанікі ўнеслі ватачнік сірыйскі ў спіс інвазіўных відаў раслін Еўропы. Гэта значыць, што такі від раслін пагражае біялагічнай разнастайнасці карэнных жыхароў – мясцовых відаў. Мала таго, умяшанне неабарыгенных відаў арганізмаў у жыццё абарыгенных лічыцца адной з буйнейшых экалагічных праблем сучаснасці. Такім чынам, увоз, перасылка, абарот, вырошчванне і выпуск у прыроднае асяроддзе насення і іншых частак расліны ватачніка сірыйскага строга забаронены.

**Ала ЦІМАШЭНКА, пенсіянерка, былая супрацоўніца даследчых установаў у сферы біягеаграфіі.**
**З выкарыстаннем фота сайта: https://na-dache.pro.**

Універсітэцкі веснік
ЗАСНАВАЛЬНІК
Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова»

Рэдактар С.Э. СОМАЎ
Карэктура: І.І. Талкачова
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212000, г. Магілёў,
вул. Касманаўтаў, 1.
☎ 70-43-51

Падпісана да друку а 17 гадзіне 30.09.2021 г. Тыраж 299 экз. Газета набрана і надрукавана ў абласной друкарні (г. Магілёў, вул. Першамайская, 70). Зак. 4194.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова